

Наша слова

Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



Газета выходзіць з сакавіка 1990 года **№ 9 (596)** **12 САКАВІКА 2003 г.**

Да Усебеларускага сходу інтэленецыі

Сяргей Панізьнік

Інсургенцыя інтэлігенцыі

Інтэлігенцыя (ад лац. Intelligehs –разумны, дасведчаны). Грамада людзей, занятая развіццём і пашырэннем культуры,

Там, у Афрыцы, грыфы.
Там, у Грэцыі, амфары.
Тут – наркомаўкі рыфмы
Да савецкай метафары.

Там – узмор'і Ла-Манша.
Там – гатэлікі Турцыі.
Тут і мова не наша:
І радкі Канстытуцыі.

Там – жывучыя персы.
Там – свабодная Індыя.
Там валютныя персі
І каханне па відэа.

Тут – падводныя рыфы.
Тут – Везувій без кратэра;
Загнівае не ў рыбы
Галава – ў праваката́ра.

Там, за Латвіяй, Балтыка.
У Італіі – ружы.
Тут – кульгае граматыка
Праз дзвюхмоўныя лужы.

Скасабочаны дзверы –
І матляецца нацыя...
Там – сядзяць аднаверцы,
Тут – стаіць інтэграцыя.

Нехта думае ў Скідзелі...
Нешта ведае Быхаў...
Тут кланіруюць "інцеляў",
Там – самоціцца Быкаў.

Падзяляе, ўладарыць
Тут і там індульгенцыя.
Дзе ж яна, з Божым дарам,
Інтэлігенцыя, -

Не праслоечка вузкая
На ганенні і кпіны,
А святло непатусклае
Для счарнелай краіны?

Веснатою набухне
Дзень разумны,
дасведчаны:
Беларусь не патухне
І з душой пакалечанай.

Тут – будзіцеляў поўня.
Тут – радовішчы жыляцца.
Тут – пры дотыку промня
І Свабода раскрыліцца!

НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСЬ – СВАБОДНАЕ І ЗАМОЖНАЕ ГРАМАДСТВА

Зварот Рабочай групы Аргкамітэту па скліканні Сходу беларускай інтэлігенцыі

Шаноўныя суайчыннікі.

Наш сённяшні стан не можа задаволіць нікога, хто жыве ў Беларусі. Большасць насельніцтва, чый узровень заробку забяспечвае толькі самыя элементарныя жыццёвыя патрэбы, знаходзіцца на мяжы жабрацтва. Але нават тыя нямногія, хто здолеў дасягнуць пэўнага матэр'яльнага дабрабыту, не ў стане адчуваць сябе ў бяспецы і спакойна карыстацца здабытым. Між тым Беларусь знаходзіцца ў цэнтры Еўропы – калысцы сусветнай цывілізацыі, месцы, дзе нарадзіліся і атрымалі развіццё агульнапрызнаныя ідэалы вольнага, культурнага і заможнага існавання чалавека ў грамадстве.

Спрадвечным прызваннем інтэлігенцыі было і ёсць асэнсаванне ходу падзей і вызначэнне найбольш аптымальных шляхоў развіцця чалавечай супольнасці. У краінах, дзе інтэлігенцыя мае належнае прызнанне, дзе яе ідэі і прапановы былі пачутыя, даўно дасягнуты адпаведны ўзровень жыцця, створаныя ўмовы, пры якіх кожны можа масімальна рэалізоўваць свае здольнасці і атрымліваць за працу узнагароду, дастатковую для таго, каб карыстацца ўсімі магчымасцямі сучаснага ўзроўню навукова-тэхнічнага равіцця. У краінах, дзе ролю інтэлігенцыю імкнуцца прынізіць да інтэлектуальнага абслугоўвання ўлады, пануюць усеагульная апатыя, перманентны эканамічны і духоўны крызіс і адсутнасць перспектыў для развіцця.

Але ніхто не можа адабраць у чалавека права свабодна думаць і выказваць свае думкі, незалежна ад таго, што б яму за гэта не пагражала. Тых, хто праяўляе мужнасць і цвёрдасць у адстойванні гэтага права, у рэшце рэшт прызнаюць і народ, і ўлада. Менавіта дзякуючы сапраўдным інтэлігентам у грамадстве ўсталёўваецца парадак, які дазваляе кожнаму грамадзяніну ўдзельнічаць у вырашэнні ўсіх істотных пытанняў і справядлівым падзеле агульных каштоўнасцяў, наладжваць у сваёй краіне спакойнае і заможнае жыццё.

Трэба знайсці мужнасць і прызнаць, што сённяшняе незадавальняльнае становішча нашага грамадства склалася ў пэўнай меры і таму, што мы, інтэлігенцыя, не выконваем належным чынам сваю адказную гістарычную місію. Гэтаму можна знайсці шмат тлумачэнняў, можна прывесці шэраг аб'ектыўных прычын, але ўсім нам неабходна зразумець, што ніхто не зробіць за нас справу, якую лёсам наканавана зрабіць менавіта нам.

Востра наспела неабходнасць вызначыцца па шэрагу неадкладных, жыццёва важных для Беларусі праблемах:

-- што трэба рабіць для захавання нацыянальнай тоеснасці беларусаў і дзяржаўнага суверэнітэту нашай краіны;

-- якім належыць быць дзяржаўнаму ладу Беларусі;

-- якім павінна быць месца Беларусі сярод краінаў Еўропы і сусветнай супольнасці;

-- як прадухіліць рэальную пагрозу эканамічнага і энергетычнага крызісу і павярнуць нашую краіну на шлях паслядоўнага дынамічнага развіцця;

-- якія захады неабходна прадпрыняць дзеля выратавання нацыі ад наступстваў Чарнобыльскай катастрофы, а таксама дэмаграфічнага крызісу;

-- якой ёсць роля Беларусі ў працэсах глабалізацыі;

-- што трэба зрабіць, каб кансалідаваць беларускую інтэлігенцыю і надаць ёй належную ролю ў грамадстве.

(Заканчэнне на ст 3.)

Юбілей "Тутэйшай шляхты"



У апошні дзень зімы 2003 года адбылася святочная ўрачыстая імпрэза, прысвечаная 10-годдзю народнага фальклорнага гурта "Тутэйшая шляхта", што створаны ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. За гады свайго станаўлення калектыў набыў шырокую вядомасць у краіне. Ён адметны, як па сваёй мелодыцы гучання, так і па арыгінальных сцэнічных касцюмах, характэрных для беларускай шляхты. Праграма канцэрту цікавая і разнастайная. Калектыў парадаваў сваіх прыхільнікаў новымі творамі. У першым аддзяленні ("Гістарычны блок") прагучалі балады Яна Чачота (пераклад на беларускую мову Кастуся Цвіркі) на музыку мастацкага кіраўніка Лявона Махнача пра важную падзею ў гісьторыі Вялікага княства Літоўскага – каранацыю першага князя Міндоўга, якой, дарэчы, сёлета спаўняецца 750 гадоў, і мы мяркуем, што дата гэтая будзе шырока адзначацца ў краіне. Былі выкананы старажытныя танцы, беларускія народныя песні часоў Рэчы Паспалітай і Крымскай вайны сярэдзіны 19 стагоддзя.

Другое аддзяленне канцэрта "Пра каханне і ўсё астатняе" ўвабрала ў сябе беларускія народныя песні, шляхетны танец "Абэрак", інструментальныя творы.

Удзельнікі ўрачыстасці цёпла віталі кожны нумар праграмы. Па добрай завядзёнцы калектыў "Тутэйшай шляхты" шчыра віншавалі прадстаўнікі БДУ і Міністэрства культуры, прыхільнікі таленту вядомага гурта.

Наш.кар.

Шырыцца падпіска на "Наша слова"

14 бібліятэк у розных абласцях Беларусі атрымаллі падарунак ад ТБМ -- бясплатную падпіску на газету "Наша слова". З сакавіка да ліпеня будзе прыходзіць газета Таварыства беларускай мовы ў сельскія бібліятэкі Сянна і Дуброўны (Віцебская вобласць), Ляхавіч і Жабінкі (Берасцейская вобласць), Ельска і Акцябрска (Гомельская). У Магілёўскай вобласці газету атрымаюць чытачы Бабруйска, Глуска, Кіраўска, Краснаполля, Магілёўскай раённай бібліятэкі. На другі квартал 2003 г. (красавік-ліпень) падпісаны бібліятэкі Мсціслава, Чавусаў і Хоцімска.

Сакратарыят ТБМ

Калі за адраджэнне мовы, чытай, спадарства, "Наша слова"!

Ф. СП - 1 **Міністэрства сувязі Рэспублікі Беларусь**

АБАНЕМЕНТ на газету / часопіс **63865** (індэкс выдання)

НАША СЛОВА (назва выдання)

На 2003 год па месяцах:

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
			X	X	X						

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча, ініцыялы)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТАЧКА

ПВ | месца | літар — на газету / часопіс **63865** (індэкс выдання)

НАША СЛОВА (назва выдання)

Кошт падпіскі / пераадрасоўкі **1374** руб. / руб. Колькасць камплектаў **1**

На2003 год па месяцах


1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12
			X	X	X						

Куды (паштовы індэкс) (адрас)

Каму (прозвішча,ініцыялы)

Віншуем з днём народзінаў сяброў ТБМ, якія прыйшлі на свет у сакавіку

Алену Антонаву
Лявона Баршчэўскага
Міхася Бутыліна
Міколу Васільчанку
Ганну Гук
Канстанціна Гуркова
Жанну Дапкюнас
Сяргея Даранкова
Рычарда Дзіцэвіча
Марыну Другакову
Людмілу Дрык
Сяргея Занкевіча
Алену Здзітавец
Ірыну Каваль
Аляксея Лапіцкага
Зміцера Малашанку
Аляксея Марачкіна
Надзею Мухіну
Аляксандра Пухоўскага
Аляксея Пяткевіча
Марту Русянчук
Зміцера Санько
Сяргея Сінькевіча
Выктара Сырыцу
Ірму Табушаву
Алега Шагуліна
Марыю Яноўскую



№ 9 (596) 12 САКАВІКА 2003 г. наша слова

Да 85-годдзя Беларускай Народнай Рэспублікі

Лявон Лаўрэш

Міністр БНР, генерал Кіпрыян (Цыпрыян) Кандратовіч

Кіпрыян (Цыпрыян) Антонавіч Кандратовіч нарадзіўся 28 красавіка1859 года ў вёсцы Зіневічы каля Ваверкі (Лідскі раён). Незаконнанароджаны сын графа Юрыя Трубяцкога, павятовага суддзі. Маці - Зінаіда Залеская - дачка абшарніка, меўшага маёнтак Місевічы каля Зіневіч. Маці выйшла замуж на шляхціца Кандратовіча, чыё прозвішча і імя па бацьку Кіпрыян і атрымаў.

Бацька Юрыя Трубяцкога – генерал-маёр Мікалай Мікалаевіч Трубяцкі, менскі губернатар. Трубяцкія – Гедзімінавічы, паходзяць ад князя Зміцера Альгердавіча, унука Гедзіміна, князя бранскага, чарнігаўскага, трубчэўскага, удзельніка Кулікоўскай бітвы, забітага пад Ворсклай у 1399 г. Ягоныя патомкі на пачатку 16 ст. ад'ехалі з Літвы служыць маскоўскаму князю. З 17 ст. гэта магутны і разгалінаваны дваранскі род Расейскай імперыі, які карыстаўся вялікім уплывам.



Генерал Кіпрыян (Цыпрыян) Кандратовіч. (Розначытанні імя ідуць ад ліцьвінскага напісання імя *Cypryan*, якое людзі чытаюць, як умеюць.)

Трубяцкія дапамагалі выхоўваць малога Кіпрыяна, далі магчымасць атрымаць адукацыю і пачаць вайсковую кар'еру. Ён вучыўся ў Лідскай павятовай дваранскай школе. Вайсковую службу пачаў ў 1875 г. у Вільні.

Кандратовічы - старажытны ліцьвінскі род, (герб - Сыракомля), што паходзіць ад Кандрата, якому ў 5 ст. былі падараваны некалькі маёнткаў. Род Кандратовічаў падзяліўся на 7 галін, унесенных у 1 і 6 частку радаводных кніг Віленскай, Віцебскай, Ковенскай, Менскай і Магілёўскай губерняў. Кандратовічы ёсць і ў спісах шляхты Лідскага павету.

Расейска-турэцкая вайна, акадэмія

У 1877 г. на пачатку руска-турэцкай вайны Кандратовіч – малады афіцэр Грэнадзёрскага корпуса. Грэнадзёры з'явіліся ў расейскім войску ў 1704 г. У грэнадзёры бралі найбольш смелых, падрыхтаваных, фізічна моцных жаўнераў і афіцэраў. У сярэдзіне жніўня 1877 г. грэнадзерскі корпус, з летніх лагерных збораў, адпраўлены на вайну. У бітве пад Плеўнай 28 лістапада 1877 г. грэнадзёры перамаглі турак, страціўшы 18 афіцэраў і 542 жаўнераў. На пачатку лістапада 1878 г. корпус вяртаецца ў Расею. Праз некалькі год пасля вайны, капітан Кандратовіч – афіцэр дзеля асобых даручэнняў пры штабе Грэнадзёрскага корпуса, напісаў кнігу "Плеўна і грэнадзёры 28 лістапада 1877 г." Апісваючы месяцы перад адпраўкай корпуса на вайну, ён пісаў:" Грэнадзёры прагна сачылі за весткамі з тэатра вайны. Часта жаўнеры пыталіся ў сваіх афіцэраў: ***"Чаму нас не бяруць? Ці хапае войскаў за Дунаем? Балюча было чуць і чытаць аб здеках турак над балгарамі. З пачуццём зайздрасці праводзілі афіцэры і жаўнеры сваіх таварышаў з першай дывізіі, якія выпраўляліся на Каўказ ваяваць з туркамі"***. Кніга атрымала шырокі розгалас і добра вядома гісторыкам руска-турэцкай вайны 1877-78 гг. У 1884 г. Кандратовіч К. А. скончыў Мікалаеўскую Акадэмію генеральнага штаба, якая давала выдатную вайсковую адукацыю і магчымасць хуткага службовага росту. Пасля акадэміі ў 1884-1900 супрацоўнічаў у газеце "Московские ведомости" у якасці вайсковага аглядальніка.

Расейска-японская вайна

У 1900-1901 гг. К. Кандратовіч - начальнік 2-й брыгады 30-й пяхотнай дывізіі. Летам 1900 г. прымае ўдзел у задушэнні паўстання баксёраў у Кітаі, атрымоўвае чын генерал-маёра. У 1900 — 1901 гг. начальнік 2-й брыгады 30-й пяхотнай дывізі. У прадчуванні вайны з Японіяй Расея хутка павялічвае колькасць сваіх войскаў на Далёкім Усходзе. Кандратовічу даручана сфармаваць у Паўднёвай Манжурыіі 9-ю Усходне-Сібірскую брыгаду з 4-х палкоў 3-х батальёнага складу. 30 студзеня 1904 г. па загаду цара пачалося дафармаванне брыгад новымі батальёнамі. Але да пачатку вайны паспелі павялічыць толькі 9-ю брыгаду. 18 лютага 1904 г. Кандратовіч завяршыў фармаванне сваіх войскаў. 6-га лютага пачалося фармаванне 1-га Усходне-Сібірскага корпуса ў складзе 3-й, 4-й, 9-й брыгад. Да лета 1904 г. 9-я брыгада папаўняецца новымі батальёнамі і становіцца 9-й Усходне-Сібірскай дывізія. Камандзірам 9-й Усходне Сібірскай дывізіі прызначаецца генерал К. А. Кандратовіч.

Руска-японская вайна пачалася 27 студзеня 1904 г. з міннай атакі японцамі рускай эскадры ў Порт-Артуры. Вайна ішла безпаспяхова для Расейскай арміі. 2 червеня 1-ы корпус генерала Штакельберга, у склад якога ўваходзіла дывізія Кандратовіча, атрымаў паразу ў Вафангоў ад войскаў японскага генерала Оку. Згодна с дыспазыцыяй рускія наступалі 3-мя калонамі, "... ***агульнае кіраўніцтва над сярэдняй і правай калонамі даручаецца начальніку 9-й дывізіі генерал-маёру Кандратовічу***".

13 студзеня 1905 г. , падчас наступу расейскага 1-га Сібірскага корпусу генерала Штакельберга, Кандратовіч быў паранены на камандным пункце. Гэты момант адлюстраваны ў мемуарах А. А. Ігнаццева: " ***Бой разгараўся з кожнай хвілінай. Загрукатала артылерыя. Хэгаўтай (кітайская вёска) пакрыўся разрывамі снарадаў. Спачатку яны ляцелі толькі з усходу, потым аднекуль з поўдня, дзе разгортвалася наша 9-я дывізія Кандратовіча ... "Добрыя войскі! Хто іх выхаваў? – падумаў я ...***

- Аляксей Аляксеявіч (Ігнаццеў А. А.), я паранены, - нечакана сказаў мне генерал Кандратовіч, які стаяў побач са мной, павіснуўшы на маёй руцэ. Кандратовіч меў рацыю, бо, паглядзеўшы на яго плечы, я заўважыў у яго шынялі выхадую адтуліну кулі. Падбеглі санітары, і Штакельберг ... сказаў: - Здайце камандаванне, генерал, жадаю вам хуткага выздараўлення."

А. А. Ігнаццеў называў генерала К. Кандратовіча ***"элегантным генштабистом"***. Наогул, Кандратовіч быў элегантным, вытанчаным і вельмі патрабавальным афіцэрам, служыць з якім падначаленым было не проста.

Пасля выздараўлення, напрыканцы 1905 г., Кандратовічу К. А. прызначаецца званне генерал-лейтэнанта.

17 ліпеня 1906 г. генерал-лейтэнант, начальнік 9-й Усходне-Сібірскай дывізіі Кандратовіч Кіпріян Антонавіч узнагароджаны Ордэнам Св. Георгія 4 ст., вышэйшай афіцэрскай узнагародай за асабістую мужнасць (*не блытаць са "Знакам Георгіеўскага ордэна" ці "Георгіеўскім крыжам" 4-х ступеняў, які быў жаўнерскай узнагародай*).

З 1906 г. К. Кандратовіч - камандзір 2-га армейскага корпуса, а з 1908 г. намеснік Туркестанскага генерал – губернатара і адначасова намеснік камандуючага Туркестанскай вайсковай акругі, начальнік штаба Сямірэчанскага казачага войска. Камандуючым войскамі акругі быў аднагодак Кандратовіча і аднакашнік па Акадэміі генеральнага штаба (таксама выпуск 1884 г.) – генерал Самсонаў А. В. Пасада Кандратовіча у Сярэдняй Азіі – пасада адміністратара. Напрыклад у адміністратыўнай кнізе Туркестанскага губернатара подпісы генерала з візай ***"Зацвярджаю", намеснік генерал-губернатара генерал-лейтэнант Кандратовіч"***, стаяць на паперах аб атрыманні крэдыту на насенне 294 кіргізам ..., якія пакутавалі ад неураджаю. (15 траўня 1909 г.) ці ***"аб выдачы крэдыту ў памеры 2465 р. на насенне для 58 арандатараў, з якіх 57 туземцаў і 1 рускі"*** (23 мая 1909 г.) і прызначэнне на пасаду начальніка 1-а Каўказкага армейскага корпуса і намесніка генерал-губернатара ў Тыфлісе. Генерал ад інфантэрыі - гэта прыблізна генерал-палкоўнік у сучасным войску. На тыя часы вышэйшае званне ў расейскай арміі -фэльдмаршал, але амаль што 50 гадоў, гэты чын не прызначаўся і, фактычна, званне генерала ад інфатэрііі (ад артылерыі, ад кавалерыі) было найвышэйшым у войску.

Каля 1910 г. пабраўся шлюбам з Адай фон Рыхтар (1879(?) – 1954). Ада фон Рыхтар (Ada von Richter) – дачка расейскага генерала фон Рыхтара нарадзілася ў Рызе, выпускніца Смольнага інстытута у Санкт-Пецярбургу. У 1912 г., калі Кіпріяну Антонавічу было 53 гады, у Тыфлісе нарадзілася Вера, адзіная дачка.

18 лютага 1910 г. у газеце "Новое время" адзін з найбольш уплывовых вайсковых аглядальнікаў таго часу Меншыкаў М. А. у артыкуле "Ці можа Расея ваяваць", ацэньваючы перспектывы будучай сусветнай вайны, пісаў: "У нашых заходніх суседзяй толькі нешматлікія камандзіры карпусоў нюхалі порах, у нас жа 10 000 начальнікаў розных ступеняй ваявалі. Генералы: ... Самсонаў, ... , Кандратовіч ... , складаюць цэлую плеяду. Усё яны дасведчаныя ільвы ў мундзірах".

Са жніўня 1913 г. Кандратовіч -- камандзір 23-га армейскага корпуса, 2-й арміі, камандуючым якой за тры тыдні да пачатку вайны прызначылі генерала ад кавалерыі Самсонава. Самсонаў – кавалерыйскі камандзір вялікай асабістай мужнасці, займаў адказныя штабныя (у тым ліку і ў Варшаўскай акрузе) адміністратыўныя пасады, але не камандаваў нават корпусам.

1-я сусветная вайна

1 жніўня 1914 г. у 17.00 Германія аб'явіла вайну Расеі.Згодна з планамі расейскага камандавання вайна павінна была пачацца з дзеяння расейскай арміі супраць Усходняй Прусіі: 1-я расейская армія генерала Ренненкампфа наступае з усходу, з раёну Вільні, адначасова з ёй 2-я армія генерала Самсонава наступае з поўдня, з раёну Варшавы. Аднак яшчэ ў красавіку 1914 г. на камандна-штабной гульні ў Кіеве, якую праводзіў вайсковы міністр Сухамлінаў, і ў якой бралі ўдзел усе камандзіры карпусоў і армій, у тым ліку і Кандратовіч, стала зразумела, што 2-я армія абавязкова спозніцца з-за адсутнасці дарог ў зоне яе высоўвання. Гэта дасць магчымасць манеўру немцам, і прывядзе да разгрому. Як быць? Вышэйшае вайсковае кіраўніцтва знаходзіць "бліскучае" выйсце. Даецца ўводная, што ў Францыі саюзнікі перамагаюць, немцы вось-вось атрымаюць паразу і нічога не робяць на ўсходзе дзеля выратавання. Наогул было вырашана, што колькасць расейскіх войскаў будзе настолькі значнай, што немцы будуць разбітыя без вялікіх праблем. У жыцці было ўсё наадварот. Каб ўратаваць ад поўнага разгрому французаў з англічанамі, наступаць давялося на 15-ты дзень ад пачатку мабілізацыі. Да гэтага тэрміну сканцэнтравалася толькі 30% планаваных сілаў. Для падходу наступных 30% небходна было яшчэ 8 дзён, але немцы былі ўжо пад Парыжам, і каб не застацца з ворагам адзін на адзін, раніцай 17 жніўня 1-я расейская армія перайшла мяжу. Усходне-Прускай апэрацыі прызначана шмат кніг, гэта адна з найбольш цяжкіх і павучальных бітваў 1-й сусветнай вайны. Але наша мэта - расказаць аб удзеле ў ёй нашага земляка, генерала ад інфатэрыі Кандратовіча К. А.


23-ці корпус пасля заканчэння мабілізаціі быў адразу разабраны на часткі. 3-я гвардзейская дывізія (генерал-лейтэнанта Сірэліўса) была адпраўлена ў Саколку, у рэзерву Паўночна-заходняга фронту, які ў гэты час знаходзіўся у Лідзе. 2-я пяхотная дывізія (генерал-лейтэнанта Мінгіна) засталася ў цвердзі Новагеоргіеўск (зараз-Модлін) і была падпарадкавана каменданту цвердзі. Кавалерыя корпуса (гвардзейская кавалерыйская брыгада) адпраўлена на Паўднёва-заходні фронт супраць аўстрыйцаў, мартырны дывізіён передадзены ў 2-гі армейскі корпус, сапёрны батальён – у цвердзь Горадня. Потым дывізію Мінгіна зноў перадалі Кандратовічу, і яна даганяла карпусы, якія наступалі. У камандзіра застаўся толькі штаб корпуса. Аднак у загадах і дырэктывах корпус лічыўся так, як быцам бы ён дзейнічаў у поўным складзе.

17 жніўня 2-я армія пачала высоўвацца да дзяржаўнай мяжы. Стаяла спякота. Карпусы наступалі бязспынна па сыпучых пясках, бяз тылавога суправаджэння, па некалькі дзён нават без хлеба. Дывізія Мінгіна, наогул, не мела абозаў, і ёй было загадана харчавацца з абозаў 15 корпуса. Ішлі без перапынкаў, без адпачынку ўдзень. Адолеўшы за 3-е сутак 80 км, армія Самсонава 20 жніўня перайшла дзяржаўную мяжу. 2-я армія складалася з 1-га, 2-га, 6-га, 13-га, 15-га і 23-га армейскіх корпусоў. Гэтак жа ў яе склад уваходзілі 4-я, 6-я і 15-я кавалерыйская дывізія, усяго 150000 чалавек, 702 гарматы, прыкладна такую ж моц мела і 1-я армія Ранненкампфа.

14 жніўня ў Беластоку Кандратовіч выдае загад па войсках корпуса № 7: ***"вярнуўшыся з камандзіроўкі 13 жніўня, прыступіў да камандавання корпусам ... 18 жніўня да 6 гадзін вечара корпусу сканцэнтравацца каля Новагеоргіеўска ..."*** .

Аднак тэлеграма галоўнакамандуючага фронтам ад 14 жніўня № 3 загадвала 3-й гвардзейскай дывізіі заставацца ў Саколцы. 16 жніўня дывізыя была перасунута ў Беласток, а 17 жніўня дывізіі загадана рухацца ў бок фронту, на Дэмбрав. Ад такога кіравання штабам акругі дывізіямі корпуса Кандратовіча, войскі пераблыталіся і генерал, прыкладна да 27 жніўня збіраў свае войскі.

(Працяг у наст. нумары.)



Адозва

Грамадскага Нацыянальнага Камітэту святкавання 750-х угодкаў каранацыі Міндоўга, Вялікага князя Навагрдскага Княства, на караля нашай старажытнай дзяржавы



Сёлета прыпадае знакамітая дата – 750-годдзе каранацыі Міндоўга, Вялікага князя Навагрдскага, на караля. У XIII стагоддзі пра гэтага мужнага ваяра гаварылі ў замках галіца-валынскіх, мазавецкіх, менскіх, полацкіх, пскоўскіх і ноўгарадскіх князёў, лівонскіх магістраў, у ірландскіх клештарах ды ў рэзідэнцыях рыжскіх біскупаў і рымсіх першасвятароў. Імя Міндоўга часта сустракаецца ў рускіх, беларускі летапісах ды лівонскіх хроніках XIII-XVI стагоддзяў.

Працяглы час асоба гэтага князя і ягоны чын былі вядомыя толькі некаторым літаратуразнаўцам ды гісторыкам, якія мелі Міндоўга за чужынца-заваёўніка, што нібыта захапіў уладу ў Навагрдскім княстве. Да ўвагі не прымалася летапіснае сведчанне пад 1235 годам пра Міндоўга, ваяводу Навагрдскага князя Ізяслава. Даследнікі гісторыі нашай дзяржавы не задумваліся, чаму ў Навагрдку недалёка ад велічнага замка ўзвышаецца гара, якую здаўна называюць "Магілай Міндоўга". Знакаміты гісторык А. Г. Кіркор пісаў, што "гэты курганны насып сведчыць пра любоў і пашану" навагрдцаў да Міндоўга. Паважалі гэтага князя лі інчане ды годна яго ўшанаваллі. Яшчэ зусім нядаўна на ўскраіне Пінска, у прадмесці Лешч, побач з славутым Ляшчынскім клештарам, узвышаўся названы "Магілай Млндоўга" курган, які цяпер можна ўбачыць толькі на малюнку Напалеона Орды ды на старых фотаздымках.

Можна ўпэўнена сцвярджаць, што Міндоўг заслужыў велічныя помнікі нейкай надзвычайнай справай. Гэта магла быць пераможная бітва войска Міндоўга з Батыевай ардой, пра што згадваецца ў некаторых летапісах. Менавіта тады Міндоўгава ратнае ўмельства, якое не раз выкарыстоўвалі полацкія, менскія і навагрдскія князі, паслужыла дзеля абароны нашых земляў ад Батыевай арды. І калі шмат якія гарады на ўсход і на поўдзень ад Прыпяці былі зрабаваныя і спапялёныя, нашыя Гомель, Тураў, Навагрдак, Пінск, Берасце засталіся квітнець. Нашыя землі не спазналі мангольскага іга.

Ваярскае ўмельства Міндоўга годна ацанілі навагрдскія феадалы і ў 1246 годзе запрасілі яго на княжанне. На Навагрдскім княскім пасадзе Міндоўг праявіў сябе абачлівым палітыкам. Тады, у сярэдзіне XIII стагоддзя, Навагрдскаму княству сталі пагражаць галіцка-валынскія князі, якія схаўрусаваліся з татара-мангольскімі ханамі. А на ўзбярэжжы Балтыйскага мора, у Ніжнім Панямонні і ў Падзвінні, набіралі сілу крыжакі. У такіх умовах навагрдскія феадалы прынялі адзіна правільнае рашэне: далучыць сваю дзяржаву да антыардынскай кааліцыі еўрапейскіх краінаў. Выкананне такіх адказных дыпламатычнай і палітычнай задачаў было даручана Міндоўгу. Пра станоўчы вынік гэтай місіі яскрава сведчыць була папы Інакенція IV ад 17 ліпеня 1251 года, якою рымскі першасвятар прыняў Міндоўга за "сына святой Рымскай Царквы", а ягоную дзяржаву "на ўласнасць свягога Пятра". Папа Інакенці IV у сваёй буле тытулаваў Міндоўга каралём, а ягоную дзяржаву каралеўствам – "Regnum". І на пачатку ліпеня 1253 года ў Навагрдку біскуп Кульмскі Гейндрых урачыста каранаваў Вялікага князя Міндоўга на караля.

У XIX стагоддзі чыны Міндоўга апявалі паэты Адам Міцкевіч, Юліюш Славацкі, які паводле сваёй драмы напісаў лібрэта да оперы Генрыка Ярэцкага "Міндове", Ян Чачот. Напрыканцы XX стагоддзя гарадзенскі кампазітар А. Бандарэнка ў садружнасці з паэтэсай Вольгай Іпатавай стварыў оперу "Князь Навагрдскі". Дзесяць гадоў таму ў Навагрдку каля гары Міндоўга ўсталявалі мемарыяльную дошку ў гонар славутага князя і караля.

Сёлета з нагоды вялікага юбілею адбудуцца навуковыя канферэнцыі, фэсты, выставы, з'явяцца новыя творы літаратуры і мастацтва, фільмы і спектаклі, помнікі, якія засведчаць пачатак новай плыні даследавання нашай гісторыі, ушанавання імя Міндоўга, Вялікага князя і караля, заснавальніка нашай старажытнай "Новгородьские державы, над Немном лежачие", як падае летапіс.

Менавіта нам, дарагія суайчыннікі, выпадае надзённая, актуальная справа: годна ўшанаваць памяць нашых продкаў – ваяроў і будаўнікоў, аратых і рамеснікаў, плён чыёй працы мужна і самааддана бараніў ваяр, вялікі князь і каролль Міндоўг. Не забудзем мы і яшчэ адну ягоную паслугу нашаму народу: у Міндоўгавай сям'і быў выхаваны Войшалк, мудры пераемца славутага бацькі, дзяржаўны дзеяч і ваяр, асветнік і летапісец, заснавальнік славутага у той час асяродка культуры, пісьменства, асветніцтва, духоўнасці, вядомага як Лаўрышаўскі кляштар.

Дык з Божай дапамогай – за працу, каб мы былі вартыя нашых славутых продкаў!

Грамадскі Нацыянальны Камітэт святкавання 750-х угодкаў каранацыі Міндоўга, Вялікага князя Навагрдскага Княства, на караля нашай старажытнай дзяржавы.

100 гадоў з дня нараджэння Тодара Кляшторнага



11 сакавіка споўнілася 100 гадоў з дня нараджэння Тодара Кляшторнага, беларускага паэта. Нарадзіўся ў в. Парэчча Лепельскага раёна. Скончыў БДУ. Працаваў на радыё. Член літаратурных аб'яднанняў "Маладняк", "Узвышша", БелАПП. Аўтар зборнікаў вершаў "Кляновыя завеі", "Светацені", "Ветразі", "Праз шторм на штурм", паэм "Палі загаманілі", "Калі асядзе муць".

У 1936 годзе быў арыштаваны. Расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957 годзе.

На яго вершы напісаны песні М. Равенскім, І. Івановым.

Шаноўныя прыхільнікі беларушчыны, чытачы "Нашага слова"!

Безумоўна, вы ведаеце, што адным з галоўных клопатаў Таварыства з'яўляецца пашырэнне беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця нашай краіны. З гэтай мэтай у плане ТБМ на 2003 год не выпадкова асобным пунктам пазначана праца з прадпрыемствамі па ўкараненні беларускамоўнага афармлення выпускалай прадукцыі. Запрашаем Вас да актыўнага ўдзелу ў такой важнай і цікавай працы. Дзеля гэтага прапануем прыкладны план дзеянняў, а таксама ўзор напісання ліста на імя кіраўніка таго ці іншага прадпрыемства, якое ёсць у Вашым горадзе.

Мы ўпэўненыя ў тым, што ваша праца будзе мець канкрэтны вынік, пра які, дзякуючы сродкам масавай інфармацыі, даведаецца шырокая грамадскасць. Калі нашая прапанова адгукнецца ў вашых сэрцах, мы зможам праз год мець станоўчы вынік у нашай агульнай беларускай справе.

Узор афармлення ліста на адрас вытворцы

Дырэктару (кандытарскай фабрыкі "Камунарка")
Копія: Рэдакцыя газеты
("Советская Белоруссия")

Паважаны...................................... !

Як грамадзяне Беларусі і як спажыўцы, мы вельмі станоўча ацэньваем лозунг "Купляйце беларускае", які заклікае спажыўцоў да набыцця тавараў айчынных вытворцаў, і кіруемся ім у нашым штодзённым жыцці. Аднак, мы вымушаны выказаць сваю глыбокую заклапочанасць тым, што тавары (цукеркі, шакалад), якія выпускаюцца на Вашым прадпрыемстве, не маюць назвы і іншай інфармацыі для спажыўца па-беларуску.

Такое стаўленне да аздаблення выпусканай прадукцыі выклікае непавагу да краіны і яе дзяржаўнай мовы ў чалавека яшчэ з маленства. Гэткім чынам адштурхоўваюцца самыя надзейныя спажыўцы, для якіх Беларусь, беларуская мова, поспех беларускіх вытворцаў не пусты гук, а найвялікшая каштоўнасць.

Нам падаецца вельмі надуманым, калі не сказаць цынічным, аргумент, што, маўляў, надпіс па-беларуску на абгортцы адмоўна адбіваецца на попыце тавару. Хутчэй наадварот, многія шукаюць тавары, аформленыя па-беларуску, каб зрабіць падарунак.

Мы лічым, што варта ўзяць за прыклад сусветную практыку афармлення тавараў, калі асноўны надпіс і асноўная інфармацыя падаецца на мове тытульнай нацыі і дублюецца на іншых мовах. (Варыянт – Мы лічым, што варта ўзяць за прыклад краіны з некалькімі дзяржаўнымі мовамі (Бельгія, Канада, Швейцарыя), дзе існуе практыка афармлення тавару, калі яго назва і іншая абавязковая інфармацыя падаецца на ўсіх дзяржаўных мовах краіны).

Таму мы звяртаемся да Вас, як да грамадзяніна Беларусі, да Вашай нацыянальнай ды прафесійнай годнасці і вельмі спадзяёмся, што Вы канструктыўна адрэагуеце на нашыя заўвагі, і мы неўзабаве ўбачым беларускую мову ў афармленні цукерак і іншых кандытарскіх выбараў, якія выпускае ваша прадпрыемства.

Просьба адказ даць на імя: *прозвішча, імя, імя па бацьку, поўны паштовы адрас.*

З павагай,

Подпіс, прозвішча, імя, імя па бацьку, адрас,

Алгарытм дзеянняў:

1. Знайсці прадпрыемства, якое выпускае прадукты ці іншую масавую прадукцыю або ,як кажуць цяпер, маюць "брэнд". Да крыкладу, у Віцебску – прадпрыемства "Віцьба", у Лідзе – завод харчканцэнтратаў, піўзавод, у Івянцы – кандытарская фабрыка, у Глыбокім і Рагачове – заводы, што выпускаюць згушчанае малако, хлебазаводы, малаказаводы, мясакамбінаты па ўсёй краіне.

2. Звярнуцца да дырэктара з лістом пра ўжыванне беларускай мовы ў афармленні прадукцыі. Копію даслаць у мясцовую або агульнанацыянальную газету і ў сядзібу ТБМ.

3. Запісацца на прыём да дырэктара і пастарацца пераканаць у неабходнасці афармляць тавары па-беларуску. Прапанаваць дапамогу ў перакладзе на беларускую мову тэкстаў.

4. Вынікі гэтых захадаў падаць праз прэсу (газеты "Наша слова", "Новы час", і інш.). калі вынік адмоўны – звяртацца да больш высокай інстанцыі. Напрыклад, да прэзідэнта канцэрна "Белхарчпрам".

НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСЬ – СВАБОДНАЕ І ЗАМОЖНАЕ ГРАМАДСТВА

Зварот Рабочай групы Аргкамітэту па скліканні Сходу беларускай інтэлігенцыі

(Заканч. Пач. на ст. 1.)

Мы звяртаемся да тых, хто ўсведамляе сваю прыналежнасць да Беларускай інтэлігенцыі, хто адчувае боль і адказнасць за лёс нашай краіны і нашага народа, хто асэнсоўвае працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі і каму ёсць, што сказаць і што прапанаваць, каб павярнуць нашую краіну на шлях станоўчага, перспектыўнага развіцця. Мы заклікаем прадстаўнікоў навукі, культуры, адукацыі, медыцыны, прадпрыймальніцтва, у іншых сферах нашага жыцця: збірайцеся па сходы, каб абмеркаваць сітуацыю, якая склалася сёння ў нашай краіне, прапануйвай-це свае ідэі і вылучайце дэлегатаў на Сход беларускай інтэлігенцыі, які адбудзецца ў Менску ў канцы студзеня 2003 года.

Неабходна, каб наш Сход адбыўся, як сапраўдны форум нацыянальнай інтэлігенцыі, дапамог нам нарэшце адчуць нашую еднасць і салідарнасць, скансалідаваць нашыя намаганні дзеля таго, каб ясна і цвёрда выказаць нашую думку народу Беларусі, афіцыйным уладам, палітычнай апазіцыі і ўсяму свету.

Сябры Рабочай групы Аргкамітэту па скліканні Сходу беларускай інтэлігенцыі **НЕЗАЛЕЖНАЯ БЕЛАРУСЬ –СВАБОДНАЕ І ЗАМОЖНАЕ ГРАМАДСТВА**

Анісім Алена
Акаловіч Леанід
Вярцінскі Анатоль
Грушавы Генадзь
Гутман Якаў
Іпатава Вольга
Колас Уладзімір
Конан Уладзімір
Купава Мікола
Мазынскі Валерый
Марачкін Аляксей
Сідаровіч Зьміцер
Трусаў Алег
Чарняўскі Міхась

Да Дня роднай мовы

19 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрылася выстава, прысвечаная Дню роднай мовы "Матчына мова". Гонар выступіць першым меў дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі А.І.Падлужны. У сваёй досыць працяглай прамове ён падрабязна расказаў пра гісторыю Інстытута. Пра асобаў айчыннага мовазнаўства, нагадаў пра юбілеі Язэпа Лёсіка і першага дырэктара Інстытута мовы С. Некрашэвіча. Затым слова меў старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускі фонд культуры" Гілеп, які падзяліўся з прысутнымі планамі на будучыню. Напрыканцы выступіў вядомы літаратуразнавец А. І. Мальдзіс, які ўсё сваё жыццё прысвяціў вывучэнню малавядомых старонак беларускай культуры. А завяршылі вечарыну студэнты Акадэміі мастацтва. Яны прачыталі творы Н. Арсеннневай, К. Крапівы, М. Багдановіча і сваім майстэрствам зачаравалі залу.


27 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы адкрылася выстава, прысвечная творчасці Л. Дранько-Майсюка.

Наш карэспандэнт.

Слухай сваё

Беларускае пасланне "Depeche Mode" будзе пачутае!

Прэцэдэнт выдання спецыфічнага дыска, які аматары і спецыялісты называюць трыб'ютам, ужо быў у беларускай фанаграфіі—маем на ўвазе трыб'ют "Песня Рок"(1997). Нагадаем, што англійскае слова "tribute" мае беларускі адпаведнік, які гучыць як "даніна". На гукавых дарожках трыб'юта звычайна запісаныя песні таго ці іншага культавага гурта ў выкананні іншых артыстаў, якія гэтым крокам падрэсліваюць сваю павагу да творчасці знакамітасці. Дык вось, першы ўзгаданы дыск можна было назваць данінай павагі да пачынальнікаў беларускага фолк-рока—ансамбля "Песняры". А вось трыб'ют, пра які размова пойдзе сёння—прысвячаецца творчасці сусветна вядомага індыгурта "Depeche Mode". Ініцыятарам яго запісу і выдання стала вядомая ў свеце фанаграфічная фірма "Philips", якая аб'явіла конкурс сярод беларускіх рок-гуртоў на лепшую апрацоўку твораў гурта "De-peche Mode". Над-піс на гэтым дыску: "All songs written by Martin L. Gore" сведчыць пра тое, што ўсе песні належаць аўтарству асноўнага кампазітара гурта Марціна Гора...



Праграму дыска, якія названы складальнікамі "Personal Depeche. Belarussian DM tribute" — "Персанальная Дэпеша. Беларускі трыб'ют для DM", распачынае на сваёй мове А. Шэдзько. Яго кавер песні "Dream On" не вельмі розніцца ад асноўнай творчасці гэтага выканаўцы: тыя ж тэксты пра "нішто", сярод якіх трапляюцца больш-менш чалавечыя думкі ды пачуцці, пакладзеныя на прафесійную музыку і дабротнае выкананне яго акампаніятараў. Але не больш...

Адным з прыемных адкрыццяў дыска можна назваць сумеснае выкананне гуртом "Нейра-Дзюбель" і спеўнай капэлай "Guda" знакамітага хіта "Depeche Mode" "I Feel You". Атрымаўся нечаканы мікст—рокрытмы гэтай апрацоўкі вельмі арганічна дапаўняюцца фальклорным вакалам "Guda" ды завяршаюцца цытаваннем народнай песні "Пасею я руту". Адна з самых арыгінальных кампазіцый трыб'юта!

Гурты "Flat", "Impett" "Ляпис Трубецкой", "Кали Юга", Людміла Краўцова прадставілі на дыск апрацоўкі хітоў "Depeche Mode" з розных альбомаў гурта, у тым ліку, і даволі ранніх, якія не вельмі часта выкарыстоўваюцца для трыб'ютаў. Іх апрацоўкі дакладна адпавядаюць таму гучанню, якое дамінуе ў іх (а не "Depeche Mode") творчасці на сённяшні дзень. Тое ж, дарэчы, можна сказаць і пра апрацоўку песні "I Want You Now", што прадставіў на дыск Зміцер Вайцюшкевіч. Быццам узяў яе са свайго новага дыска "Беларускія балады" Нажаль, не мудрыў асабліва і Аляксандр Памідораў, калі разам з гуртом "Гаер" прапанаваў на дыск даволі стандартную хард-рокавую версію песні "Never Let Me Dawn Again".

Безумоўным кантрастам гэтым апрацоўкам трэба назваць інструментальную версію твора "Depeche Mode" "It's No Good", выкананую ў мэйнстрыме вядомым беларускім джаз-рокавым гуртом "Apple Tea", а таксама версію твора "Free State", якую выканалі музыкі этна-трыо "Троіца". Прыемна ўсведамляць, што гучанне ўсіх суперсучасных лічбавых інструментаў, якія выкарыстоўваліся пры запісу гэтага твора гуртом "Depeche Mode", вельмі тактоўна тут заменены беларускімі акустычнымі інструментамі—акарынай, варганам, жалейкай. Ды і вакал І. Кірчука ў творы выконвае інструментальную функцыю і падкрэслівае прыгажосць мелодыі М. Гора.

Эмацыянальным цэнтрам дыска сталі апрацоўкі песень гурта "Depeche Mode", што прадставілі на дыск беларускамоўныя калектывы. Гурт "N.R.M." захапляе напружаным рытмам і філасофскім эсэнсаваннем складанай тэмы асабістага выбару ў версіі песні "Personal Jesus", якая названа тут "Твой Езус". Не адымеш у "энэрэмаўцаў" і арыгінальнасці погляду на сусветнавядомы твор: прыпеў да яго ў стылі рэгі—такога вы нідзе не пачуеце, дакладна!

Таямнічы "ZET" у каверы "Марны" на песню "Useless" з рэпертуару "дэпешаў" звярнуў сваю увагу на рэфлексіўнасць гэтага твору і вырашыў падкрэсліць яе з дапамогай настраёвага вакала Канцлера і чуллівых партый скрыпкі ў выканан-ні новага ўдзельні-ка "ZET"—Рыбы.

Праект Піта Паўлава "Harackija" прапанаваў на дыск яшчэ адну версію твора "I Feel You". І яна аказалася настолькі арыгінальнай і дасканалай, што складальнікі, насуперак завядзёнцы, вырашылі даць на дыску яго двойчы. Бо вакальныя і гітарныя магчымасці Піта Паўлава неверагодным чынам зачароўваюць слухачоў. Іх версія твору пад назвай "Адчуваю цябе"—добры дадатак да версіі "Нейра-Дзюбеля" і "Guda".

Як паведамілі арганізатары выдання ў Беларусі трыб'юта ""Personal Depeche. Belarussian DM tribute", падчас праслухоўвання гэтага дыска кампазітарам гурта Марцінам Горам была адзначана самая арыгінальная апрацоўка песні гурта "Depeche Mode". Такім творам была названая версія песні "Free Love" ў выкананні гурта "KRIWI". Сапраўды, песня "Без гучных словаў" кранае вастрынёй жаночых пачуццяў ды душэўных перажыванняў, якія звышнатуральна перадае голас Веранікі Кругловай. Да таго ж, упрыгожваюць гэты трэк гукі незвычайнай для замежнага вуха колавай ліры і мандаліны Піта Паўлава. Але галоўнае ў гэтай апрацоўцы—версія ўзрасла да вартасці самога арыгінала і гэта вымушаны быў прызнаць (магчыма, ускосна) і сам аўтар твора.

Калі ж зірнуць на гэтую навінку айчыннага гуказапісу глабальна, дык варта адзначыць галоўную для нас акалічнасць—беларускамоўныя рок-гурты аб'ектыўна дамінуюць не толькі ў межах нацыянальнага культурнага кантэксту, але і ў тым выпадку, калі канкурэнтна выходзяць на міжнародную арэну. Яшчэ адзін пераканаўчы аргумент для тых "патрыётаў", якія б хацелі бачыць Беларусь без беларускасці і роднай мовы!

Анатоль Мяльгуй.

В лесу родилась ёлочка, спадарства!

Ідэя ў скарбонку мараў

Давайце, браткі-беларусы, задамо сабе адно дзіцячае пытанне і хуценька на яго адкажам. Згадайце, калі ласка, па адным радку самых першых песенек і вершыкаў вашага дзяцінства.

Ага! "В лесу родилась ёлочка...". "Наша Таня громко плачет...". "Муха, муха, цокотуха...".

Вось яна, першая нацыянальная параза беларуса ў яго жыцці!

Саюз беларускіх пісьменьнікаў налічвае да 500 сяброў, а ў дзіцячых садках і сем'ях беларускія дзеці выхоўваюцца на расейскай дзіцячай літаратуры – на творах Агніі Барто, Карнея Чукоўскага, Сяргея Міхалкова, Эдуарда Успенскага, Самуіла Маршака... Вырываецца пытанне – чаму? Возьмемся за розум ды ўспомнім – няўжо ў беларускага народа няма геніяльных дзіцячых вершыкаў на ўзроўні расейскіх "Телефон", "Дядя Стёпа", "Муха-цокотуха"? Напэўна, ёсць! Але іх менш, яны раскіданыя і малавядомыя. Беларускамоўны дзіцячы кнігадрук ледзь дыхае, кніжныя крамы заваленыя расейскай дзіцячай літаратурай. Але варта спытаць і ў сучасных беларускіх паэтаў: ці ёсць вам што сказаць нашым дзеткам? Дзіця папросту выбера лепшае, сапраўднае. Першая лінія народнага фронту праходзіць цераз дзіцячыя сэрцы.

Пытаеце, што рабіць? Беларускай нацыі востра неабходнае выданне кнігі выбранай беларускай паэзіі для дзяцей дашкольнага ўзросту. Вось рэальны плян яе выдання.

1. Абвясціць па ўсёй Беларусі і па беларускіх дыяспарах замежжа ў сродках масавай інфармацыі такіх, як незалежныя газеты, радыё "Свабода", незалежныя студыі тэлебачання, выданні грамадскіх арганізацый, па тэлефоннай сувязі і электроннай пошце, цераз абвесткі і г. д. пра тое, што збіраецца матэрыял кнігі выбранай беларускай паэзіі для дзяцей дашкольнага ўзросту. Падаць адрас, куды можна будзе дасылаць творы. А чаму б і не на адрас рэдакцыі "Нашай Нівы"?

2.Стварыць кампетэнтную рэдкалегію для выбару матэрыялу кнігі з дасланых твораў, а таксама з усіх папярэдніх выданняў (кніг, часопісаў, газет і г.д.) А мо гэту працу зрабіў бы і адзін дасведчаны чалавек? Я прапанаваў быць укладальнікам гэтай кнігі аднаму дасведчанаму ў дзіцячай літаратуры паэту з Менска. Але ён кажа, што пакуль не будуць знойдзеныя грошы на выданне кнігі (і на аплату ягонай працы), то ён за яе не возьмецца. Аднак, спадарства, каб атрымаць грошы на выданне кнігі, адкуль бы ні было, мы мусім спачатку мець у руках гатовы матэрыял кнігі, а не ката ў мяху.

3. Рэдкалегіі трэба выбраць у кнігу самыя выдатныя, яскравыя вершы для дзяцей дашкольнага ўзросту. Прычым, выбраць якасна і патрабавальна, а не на падставе літаратурнага сяброўства, сваяцтва і ўціску "літаратурных аўтарытэтаў".

4. Абвясціць і правесці сярод мастакоў конкурс на афармленне кнігі.

5. На наша шчасце, будучая кніга можа спачатку жыць і ў электронным выглядзе. Вось чаму яе трэба адразу ж змясціць у Інтэрнэце, распаўсюджваць на электроннай пошце, на дыскетах, кампакт-дысках, а пасля, як знойдзем грошы – надрукаваць.

6. Знайсці грошы на выданне кнігі. На святую справу добрым людзям Бог дапаможа.

7. Выбраць выдавецтва, напрыклад "Беларускі кнігазбор" і надрукаваць у ім кнігу, як мага, большым накладам, хаця б 5-тысячным.

8. Распаўсюдзіць кнігу па садках, школах, бібліятэках, праз кнігарні, з дапамогаю грамадскіх арганізацый, партыяў, установаў культуры і адукацыі, з дапамогаю дабраахвотнікаў ды іншымі шляхамі.

9. Разаслаць арыгінал-макет кнігі ў электронным і раздрукаваным выглядзе па выдавецтвах, грамадскіх арганізацыях, дыяспарах замежжа і даць ім права на дадатковую раздрукоўку кнігі, каб павялічваць яе агульную колькасць.

Вы можаце спытацца: ці ёсць досвед здзяйснення падобнай ідэі? Ёсць! Так, маючы толькі ідэю і намер, аўтар гэтага звароту адзін (!) сабраў матэрыял, знайшоў мастака, грошы, арганізаваў выданне кнігі выбранай беларускай паэзіі перыяду 1980-95 гадоў "Агледзіны" накладам 1400 паасобнікаў у выдавецтве "Беларускі кнігазбор". То няўжо цяпер мы ўсе разам – уся міжнародная беларуская супольнасць, не здолеем выдаць і кнігу для нашых самых маленькіх беларусаў?

Людзям, як хлеб, патрэбныя народная мары, справы і героі! Тады яны – Народ!

Алесь Бакач,
г. Баранавічы.



Мазырскі фальклорны ансамбль "Сваякі" нядаўна вярнуўся з Таліна, дзе паспяхова выступіў перад сябрамі таварыства беларусаў "Спадчына".

На здымку: харэаграфічная група ансамбля "Сваякі" Галіна Мурашка, Наталля Пятровіч, Кацярына Голас, Сяргей Басак і Аляксандр Антановіч.

Фота Сяргея Халадзіліна, БелТА.

Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік: ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі: № 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі: 220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў: 231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by
http://tbm.org.by/ns/

Рэдакцыйная калегія:
Алена Анісім, Вадзім Болбас, Міхась Булавацкі, Людміла Дзіцэвіч, Ірына Марачкіна, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Людміла Піскун, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко, Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні. 231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 10. 03. 2003 г.
Наклад 2300 асобнікаў. Замова № 881.
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 458 руб., 3 мес.- 1374 руб.
Кошт у розніцу: 120 руб.